На слыху

# РАССЛАБЛЯЦЦА РАНА

**У Беларусі з пачатку ўспышкі зарэгістравана 8022 выпадкі COVID-19. Прырост за апошнія суткі склаў 741 выпадак. Паправіліся 938 чалавек, у якіх раней была лабараторна пацверджана каранавірусная інфекцыя. Усяго ў краіне праведзена 122 543 тэсты. За ўвесь перыяд распаўсюджання інфекцыі памерла 60 пацыентаў з каранавіруснай інфекцыяй і хранічнымі хваробамі.**

Міністэрства аховы здароўя і кіраўніцтва праваслаўнай царквы заклікаюць на вялікія выхадныя, у тым ліку на Радаўніцу, не выязджаць за межы вашых населеных пунктаў, не наведваць могілкі і не сустракацца з роднымі і блізкімі, у прыватнасці з людзьмі сталага веку.

У Беларусі ў гэты час праходзіць рэспубліканскі маніторынг устаноў аховы здароўя па гатоўнасці работы ў перыяд эпідэмічнага пад'ёму COVID-19. На мінулым тыдні рэспубліканская рабочая група ў складзе галоўнага пазаштатнага інфекцыяніста Міністэрства аховы здароўя Ігара Карпава, галоўнага пазаштатнага анестэзіёлага-рэаніматолага Міністэрства аховы здароўя Аляксандра Дзядзько, загадчыка кафедры інфекцыйных хвароб БелМАПА Юрыя Горбіча і іншых вядучых спецыялістаў правялі маніторынг устаноў аховы здароўя Мінска, Віцебскай, Мінскай і Брэсцкай абласцей. Праблемныя пытанні яны абмеркавалі ў рэжыме відэаканферэнцый з галоўнымі ўрачамі бальніц раёнаў. Прыняты неабходныя кіраўніцкія рашэнні з прадстаўнікамі выканкамаў.

На гэтым тыдні рэспубліканская група наведала ўстановы аховы здароўя Буда-Кашалёва і Гомеля. Спецыялісты правялі кансіліумы для складаных пацыентаў. Асаблівую ўвагу ўдзялілі абароненасці медработнікаў. У найбліжэйшы час маніторынг працягнецца — спецыялісты наведаюць і іншыя бальніцы, правядуць нарады з удзелам кіраўніцтва рэгіёнаў.

**Алена КРАВЕЦ.**

На кантролі

# Выяўляюць парушэнні з боку кіроўцаў-транзітнікаў

**За невыкананне кіроўцамі патрабаванняў па пастанове № 171 Транспартная інспекцыя выявіла 192 факты парушэння кіроўцамі, якія праязджаюць транзітам па тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. У прыватнасці, па 107 фактах распачаты адміністрацыйны працэс (арт. 23.4 КаАП РБ), 16 кіроўцаў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці, па 85 фактах былі выкліканы супрацоўнікі мытных органаў і ДАІ.**

Паводле інфармацыі ДАІ, выяўлена 692 парушэнні, па звестках Дзяржаўнага мытнага камітэта — 576.

На сёння кіроўцам, якія ажыццяўляюць транзітныя аўтамабільныя перавозкі грузаў, Транспартнай інспекцыяй выдадзена 15 599 патрабаванняў.

У мэтах аператыўнага рэагавання і павышэння эфектыўнасці мер па прадухіленні распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі на тэрыторыі краіны Мінтранс сумесна з МУС прапаноўвае грамадзянам у выпадку выяўлення фактаў парушэння пастановы Саўміна № 171 кіроўцамі міжнароднікаў інфармаваць аб дадзеных фактах супрацоўнікаў органаў ДАІ па тэл. 102 і Транспартнай інспекцыі па тэл. (017) 286 76 96.

У дачыненні да правапарушальнікаў выкарыстоўваецца адміністрацыйнае спагнанне. Санкцыя ў адпаведнасці з арт. 23.4 КаАП Рэспублікі Беларусь прадугледжвае накладанне штрафу да 50 базавых велічынь або адміністрацыйны арышт.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# БЕЛАРУСКІЯ АРТЫСТЫ ЗНОЎ СПЯЮЦЬ У ПАДТРЫМКУ МЕДЫКАЎ

**Другі па ліку музычны анлайн-марафон у падтрымку медыцынскіх работнікаў #БеларусьБезCovid правядзе 24 красавіка прадзюсарскі цэнтр «Спамаш». На працягу 10 гадзін у сталічнай студыі гуказапісу будзе гучаць жывая музыка, а слухачам і гледачам канцэрта прапануюць паўдзельнічаць у зборы сродкаў на дабрачынны рахунак Віцебскай абласной клінічнай бальніцы.**

Музычны марафон ужо згадзіліся падтрымаць папулярныя беларускія артысты і калектывы: заслужаныя артысты Беларусі Аляксандр Саладуха, Іскуі Абалян, Алена Ланская, беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры», гурты «Дзядзька Ваня», «Тяни-Толкай», Las Vegas, саліст Вялікага тэатра Беларусі Ілья Сільчукоў, артысты прадзюсарскага цэнтра «Спамаш» Іван Здانюк і Ксенія Галецкая, Саша Нема, Аляксей Хлястоў, Віталь Вараненка, Улад Чыжыкаў і гурт «Радыёхваля», Ганна Шалюціна і Yogurt band, Саша Захарык, пераможцы беларускага нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне» дуэт VAL і многія іншыя. А віртуальна да канцэрта далучацца таксама выканаўцы з блізкага замежжа — Руслан Аляхно, які цяпер знаходзіцца ў Расіі, Яўген Літвінковіч (Украіна), Дамінік Джокер (Расія) — і пляменнік славутага італьянскага спевака Фабрыцыя Чэлентана (Італія).

Дарэчы, другі анлайн-марафон #БеларусьБезCovid падтрымае міждзяржаўная тэлерадыёкампанія «МІР», якая з 12 гадзін 24 красавіка зладзіць прамую трансляцыю шматгадзіннага канцэрта на радыё «Мір» у Беларусі», на сайце https://mir24.tv і на ўсіх сваіх афіцыйных старонках у сацсетках. Таксама трансляцыя будзе дасяжная на YouTube-канале TheSpamash https://www.youtube.com/user/TheSPAMASH і на платформе gigagig.tv.

Нагадаем, першы музычны анлайн-марафон прайшоў у студыі «Спамаш» 3 красавіка. Яго трансляцыю на розных платформах паглядзела амаль 8 тысяч інтэрнэт-карыстальнікаў, а на рахунак мінскай 3-й гарадской клінічнай бальніцы імя Я. Клумава паступіла каля 24 тысяч беларускіх рублёў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Fitch прадказала рэцэсію «беспрэцэдэнтнай глыбіні»



Агенцтва Fitch з-за каранавіруса чакае сёлета ў сусветнай эканоміцы рэцэсію «беспрэцэдэнтнай глыбіні» для пасляваеннага перыяду. Гэта гаворыцца ў красавіцкім дакладзе Global Economic Outlook (GEO). Паводле новага прагнозу аналітыкаў агенцтва, глабальны ВУП паменшыцца на 3,9 %. Эканоміка еўразоны знізіцца ў гэтым годзе на 7 %, ЗША — на 5,6 %, Вялікабрытаніі — на 6,3 %. Прагноз зніжэння сусветнага ВУП у працэнтным выражэнні эквівалентны яго падзенню на $2,8 трлн у параўнанні з узроўнем 2019 года і прадугледжвае страту $4,5 трлн у параўнанні з прагнозам Fitch для глабальнай эканомікі на бягучы год, які быў зроблены да ўзнікнення пандэміі. «Найбольш істотна прагноз пагоршаны для еўразоны, дзе ўведзеныя абмежавальныя меры аказалі сур'ёзны ціск на эканамічную актыўнасць ужо ў першым квартале», — адзначаецца ў дакладзе.

## Netflix падчас каранціну павялічыў аўдыторыю на 16 мільёнаў падпісчыкаў

Стрымінгавы сэрвіс Netflix апублікаваў справаздачу з вынікамі дзейнасці ў першым квартале. 2,3 млн новых карыстальнікаў з'явілася ў Netflix у ЗША і Канадзе, 6,9 млн — у Афрыцы і на Блізкім Усходзе, 2,9 млн — у Лацінскай Амерыцы і 3,6 млн — у Азіі. Цяпер агульная колькасць падпісчыкаў сэрвісу па ўсім свеце дасягнула 183 мільёнаў чалавек. Кіраўніцтва Netflix выказала меркаванне, што ў другім квартале аўдыторыя павялічыцца на 7,5 млн чалавек, паведамляе Deadline. Нягледзячы на рызыкі сыходу аўдыторыі пасля каранціну, аналітык Bernstein Тод Юнгер лічыць, што людзі не змогуць адмовіцца ад выкарыстання стрымінгавых сэрвісаў. Сёлета акцыі Netflix выраслі амаль на трэць, у той час як іншыя сферы забаўляльнага бізнесу — ад тэматычных паркаў да спорту — церпяць каласальныя страты.




## У Кітаі няма рынкаў, дзе гандлююць дзікімі жывёламі



Афіцыйны прадстаўнік МЗС КНР Гэн Шуан заявіў, што ў краіне няма так званых мокрых рынкаў, дзе гандлююць дзікімі жывёламі. «Замест гэтага ў Кітаі часцей за ўсё можна ўбачыць фермерскія рынкі і рынкі морапрадуктаў, дзе прадаюцца свежае мяса, рыба, гародніна, морапрадукты і іншыя сельскагаспадарчыя прадукты, а рынкаў, дзе гандлююць жывой хатняй птушкай, вельмі мала», — заявіў дыпламат. Ён падкрэсліў, што ўлады Кітая раней прынялі рашэнне аб забароне нелегальнага палявання і гандлю дзікімі жывёламі, а таксама ўвялі забарону на спажыванне ў ежу іх мяса.

Надвор'е

# ЗЯМЛЯ ДАЧАКАЛАСЯ ДАЖДЖУ

## А ў суботу ў асобных раёнах магчымы навальніцы

**У другой палове гэтага тыдня на тэрыторыі краіны назіралася змена паветраных патокаў, пасля чаго пачало паступаць больш цёплае паветра. У канцы тыдня і наступныя працяглыя выхадныя дні надвор'е ў Беларусі зменіцца. Фон атмасфернага ціску будзе зніжацца, што прывядзе да павелічэння воблачнасці, а няўстойлівыя паветраныя масы і атмасферныя франты, якія ідуць з Балтыйскага мора, прынясуць кароткачасовыя дажджы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Калі ў пятніцу паветра ў нас прагрэецца да плюс 12—18 градусаў, а па паўднёвым захадзе краіны — да плюс 20, то на наступны дзень кароткачасовыя дажджы рознай інтэнсіўнасці чакаюцца на большай частцы тэрыторыі краіны. У дзённыя гадзіны ў суботу ў асобных раёнах магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе плюс 2—8 градусаў, удзень — ад плюс 9 градусаў да 16 цяпла, па паўднёвым усходзе — да плюс 18 градусаў.

У нядзелю і панядзелак наша тэрыторыя будзе знаходзіцца ў вобласці паніжанага атмасфернага ціску, таму чакаецца распаўсюджванне халоднай і вільготнай паветранай масы. У асобных раёнах прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра зноў панізіцца. І ўжо ўначы будзе ад мінус 4 градусаў да плюс 3 градусаў, удзень — плюс 8—15 градусаў, толькі па паўднёвым захадзе краіны паветра прагрэецца да 17 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у аўторак і сераду з Заходняй Еўропы чакаецца перамяшчэнне франтальных падзелаў. Месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Надвор'е будзе не зусім камфортнае, таму што прагназуецца зусім няўстойлівы тэмпературны рэжым. Беражыце сябе, будзьце здаровыя.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Футбол

# У «ДЫНАМА» НОВЫ ГАЛОЎНЫ

**Леанід КУЧУК прыступае да работы са сталічнымі футбалістамі. Сёння першы матч пад яго кіраўніцтвам**

**Трэнер афіцыйна прадстаўлены ў якасці галоўнага наставіка, на гэтай пасадзе ён змяніў Сяргея Гурэнку. Нагадаем, на старце чэмпіянату краіны мінскае «Дынама» ў пяці матчах набрала 6 ачкоў, атрымаўшы дзве перамогі і тры паражэнні. Перад стартам першынства клуб «вылецеў» з розыгрышу Кубка краіны.**




Леанід Кучук адзначыў, што для яго вялікі гонар узначаліць «Дынама», бо значная частка гісторыі станаўлення аднаго з флагманаў беларускага футбола прайшла на яго вачах. «Ніякіх сумневаў наконт работы ў «Дынама» ў мяне не было. Гэта клуб з вялікімі традыцыямі, якому хутка споўніцца сто гадоў. Бачыў у гульні выдатных спартсменаў, якія здабывалі славу айчыннага футбола. Шмат з кім з іх знаёмы асабіста. «Дынама» — гэта брэнд, які ведаюць і паважаюць ва ўсім футбольным свеце. Калі вы назіралі за маёй трэнерскай кар'ерай, то ведаеце: я рэдка прыходзіў у клуб, дзе быў поспех. Перада мной заўсёды ставілі пэўныя задачы, і я рабіў так, што клуб заставаўся на плаву і займаў высокія месцы. Чэмпіянат у Беларусі толькі пачаўся, так што нічога не страчана». Настаўнік дадаў, што ўзровень чэмпіянату Беларусі па футболе ў параўнанні з нядаўнім мінулым прыкметна вырас. «Мне ёсць з чым параўноўваць, бачыў гульні чэмпіянатаў 12 краін: пачынаючы ад Малдовы і заканчваючы Італіяй. Зараз за падзеямі ў чэмпіянаце Беларусі пільна сочаць ва ўсім свеце, і многія футбалісты мараць стаць яго ўдзельнікамі», — адзначыў Кучук.

Нагадаем, з'яўляючыся гульцом, Леанід Кучук, якому цяпер 60 гадоў, выступаў у «Гомсельмашы», віцебскім КІМе, «Маладзечне», мінскіх «Атацы» і «Дынама-93». Трэнерскую кар'еру пачаў у 1990 годзе. Пад яго кіраўніцтвам цірaспальскі «Шэрыф» шэсць разоў станавіўся чэмпіёнам і па тры разы выйграваў Кубак і Суперкубак Малдовы. Леанід Кучук прывёў маскоўскі «Лакаматыў» да «бронзы» чэмпіянату Расіі. У 2019 годзе ён узначальваў украінскі «Рух» з Львова.

Сёння сталічнае «Дынама» правядзе матч у гасцях у «Смалявічаў».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**